УДК 947.6

П. С. Кручак, асістэнт

# ПРАБЛЕМА БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ Ў ПРАЦАХ М. К. ЛЮБАЎСКАГА

This article is dealing with a contribution of the famous historian M.Lubausky in investigation of the problems of formation of the Belarussian State system.

Адным з самых вядомых беларускіх гісторыкаў перыяду сярэднявечча з'яўляўся М.К.Любаўскі (1860-1936). Нягледзячы на тое, што ўсё сваё жыццё вучоны пражыў за межамі Беларусі, яго ўклад у даследаванне мінулага нашай краіны вялізарны. Нездарма вучань М.Любаўскага, а ў далейшым вядомы беларускі гісторык У.І.Пічэта адзначаў, што ўся беларуская гістарыяграфія прама або ўскосна ідзе па шляху, які пралажыў М.Любаўскі.

Важнае месца ў працах М.Любаўскага займала гісторыя беларускай дзяржаўнасці. Вучоны быў упэўнены, што на працягу большай часткі сваёй гісторыі беларусы не мелі сваёй уласнай самастойнай дзяржавы. Такі пункт погляду вызначаў і перыядызацыю гісторыі Беларусі, якую прапанаваў вучоны. М.Любаўскі выдзяляе 4 перыяды беларускай гісторыі: 1. Кіеўскі (IX-XII стст.); 2. Літоўскі (XIII - сяр. XVI ст.); 3. Польска-літоўскі (другая палова XVI - XVIII стст.) і 4. Рускі (XIX - пачатак XX ст.). Як бачна, за крытэрый сваёй перыядызацыі гісторык узяў факт уваходжання беларускіх зямель у склад таго ці іншага дзяржаўнага ўтварэння.

Першы перыяд беларускай гісторыі разглядаўся М.Любаўскім вельмі схематычна. Родапачынальнікам беларусаў вучоны лічыў усходнеславянскае племя крывічоў, якое насяляла басейны З.Дзвіны і вярхоўе Дняпра. Зачаткі беларускай дзяржаўнасці гісторык бачыў у Полацкім княстве. Разглядаючы гісторыю старажытнарускай дзяржавы, М.Любаўскі падкрэсліваў асобае месца ў ёй Полацка. Гісторык адзначаў, што полацкія князі заўжды з'яўляліся заклятымі ворагамі Кіева і імкнуліся да поўнай незалежнасці ад яго. Вытокі гэтага сепаратызму М.Любаўскі бачыў у настроях самога насельніцтва Полацкай зямлі, якое мела свае ўласныя эканамічныя і гандлёвыя інтарэсы і не жадала лічыцца з інтарэсамі астатняй Русі (Любавский М.К. Основные моменты истории Белоруссии. - М., 1918. - С. 23).

Аналізуючы палітычны лад Полацкага княства, вучоны падкрэсліваў вялікую ролю гарадскога веча, якое выражала інтарэсы мясцовага насельніцтва і абмяжоўвала ўладу князя.

Асноўную ўвагу М.Любаўскі ўдзяляў даследаванню гісторыі Вялікага княства Літоўскага. На думку вучонага, ВКЛ напачатку з'ўлялася дзяржавай не проста літоўскай, а літоўска-рускай. Пры гэтым пад тэрмінам «рускі» вучоны разумеў той славянскі элемент, які насяляў тэрыторыю сучаснай Беларусі і Украіны і ў далейшым з'явіўся асновай для фарміравання беларускай і ўкраінскай народнасці (Любавский М.К. Очерк истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно. - М., 1915. - С. 1).

М.Любаўскі падкрэсліваў, што гісторыя беларуска-літоўскай дзяржавы з'яўлялася непасрэдным працягам гісторыі Кіеўскай Русі. Вучоны адзначаў, што ВКЛ захавала значна больш традыцый і рыс Кіеўскага перыяду, чым Русь Уладзіміра-Суздальская, якая будавала сваё жыццё на новых пачатках, што склаліся пад уплывам мангола-татарскага нашэсця.

М.Любаўскі прыйшоў да высновы, што новая дзяржава стваралася часткова шляхам заваёвы беларускіх зямель літоўцамі, а часткова шляхам добраахвотнага далучэння некаторых «рускіх» зямель да асноўнага дзяржаўнага ядра. Пры гэтым вучоны падкрэсліваў, што прымусовае далучэнне насіла другасны характар. Усё гэта прывяло да таго, што ў Вялікім княстве Літоўскім усталяваўся федэратыўны лад. Напрыклад, Полацкая і Віцебская землі доўгі час захоўвалі вялікую самастойнасць. У новай дзяржаве панавалі «рускія» законы, «рускія» парадкі і «руская» мова. Многія князі абруселі да такой ступені, што нават не ведалі літоўскай мовы.

У якасці галоўнай прычыны ўтварэння ВКЛ М.Любаўскі бачыў знешнюю пагрозу з боку крыжакоў і мангола-татар. Гісторык разглядаў утварэнне ВКЛ як своеасаблівую рэстаўрацыю былой Кіеўскай дзяржавы, узнаўленне парушанага адзінства. Як збіральніца «рускіх» зямель ВКЛ, лічыць вучоны, больш чым на сто гадоў апярэдзіла Маскоўскую дзяржаву (Любавский М.К. Очерки истории Литовско-русского государства до Люблинской унии включительно. - М., 1915. - С.36-37).

Аналізуючы сацыяльна-палітычныя сістэмы ВКЛ і Маскоўскай дзяржавы, М.Любаўскі прыйшоў да высновы, што яны развіваліся ў супрацьлеглых накірунках. Маскоўская дзяржава развівалася ў накірунку манархічнага абсалютызму і адміністрацыйнага цэн-

тралізму. Урэшце рэшт, яна набыла форму спадчыннай і неабмежаванай манархіі з моцным цэнтральным апаратам.

У адрозненне ад Маскоўскай дзяржавы, ВКЛ развівалася ў напрамку канстытуцыялізму і федэралізму. Яго палітычная сістэма набыла форму выбарчай манархіі, абмежаванай Радай і Сеймам. Пры гэтым мясцовае кіраванне адыгрывала ў ВКЛ значную ролю і мела рысы аўтаноміі. Такая сітуацыя замацоўвалася прывілеямі, якія давала месцам вялікакняжацкая ўлада.

У сваёй рабоце «Очерки истории Литовско-русского государства до Люблинской унии включительно» М.Любаўскі дае адказ на пытанне: чыёй дзяржавай з'яўлялася Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае? Ён выступіў супраць канцэпцыі гэтак званай «літоўскай дзяржаўнасці», якая даказвала прыярытэт літоўскіх феадалаў у ВКЛ. Гісторык падкрэсліваў, што гэта пытанне неабходна разглядаць у дынаміцы. На першым этапе станаўлення палітычнай сістэмы ВКЛ вядучую ролю адыгрываў славянскі элемент. Потым, пасля Крэўскай уніі, дамінаваць пачынаюць літоўска-каталіцкія паны і баяры. Аднак у выніку напружанай барацьбы на працягу XV-XVI стст. беларуска-украінская частка феадалаў праваслаўнага і пратэстанцкага веравызнання дабіваецца палітычнага парытэту і дзяржаўная ўлада больш-менш прапарцыянальна размяркоўваецца паміж магнатамі і шляхтай славянскага і балцкага паходжанняя. Таму і дзяржаву М.Любаўскі называў літоўска-рускай.

Палітычную гісторыю ВКЛ XV-XVI стст. М.Любаўскі падзяляў на два перыяды. Першы (40-я гг. XV ст. - 40-я гг. XVI ст.)—час княжання Казіміра і яго сыноў. Вядучая палітычная роля ў грамадстве належала ў гэты перыяд беларуска-літоўскай арыстакратыі—князям і панам. Шляхта адыгрывала другасную ролю. Другі перыяд—час вялікага княжання Сігізмунда-Аўгуста (1548-1572). Шляхта ў гэты час дабіваецца роўных правоў, перапрацоўвае заканадаўства, дзякуючы чаму палітычны лад ВКЛ набліжаецца да польскага. Каб замацаваць такое становішча, шляхта ставіць пытанне аб уніі з Польшчай. Люблінская унія 1569 г., на думку М.Любаўскага, паклала канец самастойнаму існаванню літоўска-рускай дзяржавы.

Аналізуючы гісторыю Беларусі XV-XIX стст., М.Любаўскі адзначаў той факт, што шмат жыццёвых сіл беларусаў пайшло на будаўніцтва не ўласнай, а агульнай дзяржаўнасці. Гэта прывяло да масавай эміграцыі беларусаў спачатку ў польскую, а потым у рускую нацыянальную супольнасць і культуру. Такая эміграцыя знясільвала на-

цыю, аднімала ў яе лепшых, творча актыўных прадстаўнікоў. Таму вучоны зрабіў выснову, што ніякае паляпшэнне жыцця, ніякі прагрэс немагчымы для народа, лепшыя сілы якога павінны пакідаць сваю бацькаўшчыну і шукаць сваёй долі сярод суседніх народаў.

Такім чынам, праблема беларускай дзяржаўнасці займала адно з важнейшых месцаў у творчасці вядомага беларускага гісторыка М.К.Любаўскага. Вучоны адным з першых паставіў пытанне аб неабходнасці стварэння беларусамі ўласнай дзяржаўнасці, і яго імя мы можам па праву занесці ў спіс пачынальнікаў беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі побач з імёнамі М.Доўнар-Запольскага, У.Ігнатоўскага і В.Ластоўскага.

УДК 378.147

А. В. Перевозный, ст. преподаватель

## О НЕКОТОРЫХ НАПРАВЛЕНИЯХ РЕФОРМЫ ОБРАЗОВАНИЯ ЗА РУБЕЖОМ

In the article the main directions of the reform of currens education are discussed. Among them one can mention: correlation of centralization and decentralization, differentiation of education, implementation of educational technologies.

В настоящее время во многих зарубежных странах осуществляется реформирование образования. Потребность в реформах обусловливается экономическими и культурными потребностями общества. Среди факторов долговременного характера, стимулирующих образовательные реформы, называются следующие:

– информационный взрыв, быстрое развитие информационных технологий, усиление роли профессиональных знаний;

– осознание того, что интеллект нации – ключевой экономический ресурс, даже более значимый, чем, например, наличие полезных ископаемых;

– усиление конкуренции на мировых товарных и финансовых рынках вследствие интенсификации международной торговли, ликвидации тарифных барьеров, появления новых государств с развитыми экономиками;

– исчезновение многих ныне существующих рабочих мест, особенно в обрабатывающей промышленности;